# *ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ «ПАБУДОВА»*



**19 снежня 2023 года створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Гродзенскай грамадскай літаратурнай школай пачата вывучэнне кампазіцыі літаратурнага твора. Занятак на тэму «Мастацкія дэталі. Кампазіцыя твора» насіў аглядны характар і даў старт паэтапнаму даследаванню на практыцы элементаў кампазіцыі.**

Усе яны былі пералічаны і ахарактарызаваны ў ходзе тэарэтычнага блока. Былі пералічаныя і апісаны таксама функцыі кампазіцыі, яе віды, кампазіцыйныя прыёмы, асаблівасці сюжэтнай кампазіцыі і кампазіцыі казкі. Акцэнт быў зроблены на элементах кампазіцыйнай структуры твора як на будаўнічым матэрыяле для літаратурнага тэксту. У перакладзе з лацінскай мовы «кампазіцыя» значыць «пабудова».



Па традыцыі пасля тэарэтычнага блока слухачы школы паспрабавалі прааналізаваць кампазіцыю некаторых аўтарскіх твораў, вылучыць яе элементы, апісаць іх ўласцівасці і значэнне. У займальнай творчай гутарцы прынялі ўдзел празаікі і лірыкі. Стала зразумела – у якім з родаў літаратуры элементы кампазіцыі вылучыць прасцей і чаму. Але і перад цяжкасцямі Гродзенская грамадская літаратурная школа ніколі не рабела. Агульнымі намаганнямі пастаўленыя задачы былі паспяхова вырашаны. Творчы вопыт папоўнілі новыя веды (альбо асвяжыліся ў памяці атрыманыя раней). Атмасфера ў ходзе заняткаў склалася прыязная, нязмушаная і нават праявы крытычнага мыслення яе не сапсавалі, а наадварот, зрабілі сустрэчу калег больш змястоўнай.

Па тэме снежаньскага занятку выступілі сучасныя гродзеннскія літаратары, аматары літаратуры, нашы верныя сябры: Кацярына Калік, Вольга Дзіканава, Эла Едэшка (дэбютант ГГЛШ), Алена Руж, Соф'я Судзьіна, Таццяна Лугавая, Святлана Глембоцкая, Вольга Клімянкова. Алена Шаламіцкая паведаміла цікавую інфармацыю з гісторыі сусветнай літаратуры аб кампазіцыі твораў-мініяцюр. Людміла Кебіч і Дзмітрый Радзівончык прааналізавалі кампазіцыю ўласных твораў.

Да ўсеагульнай радасці занятак літшколы наведалі новыя людзі. А гэта значыць, што рух нашай супольнасці па шляху авалодання каштоўнымі ведамі, у накірунку творчага прагрэсу будзе працягвацца, будзе атрымліваць увасабленне ў новых таленавітых творах і кнігах. І новыя кнігі нашых сяброў мы таксама ўбачылі! У якасці сур’ёзнага недахопа трэба назваць нізкую зацікаўленасць працай літшколы з боку калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ.

Стаў гісторыяй яшчэ адзін літаратурна-навучальны год. У фінале першага прысвечанага кампазіцыі і апошняга ў 2023 годзе занятку найбольш актыўныя слухачы Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы атрымалі падзячныя лісты Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На здымках:** Гродзенская грамадская літаратурная школа пачала новы тэматычны цыкл заняткаў (тэма першай сустрэчы «Мастацкія дэталі. Кампазіцыя твора»). Найбольш актыўныя і стабільныя наведвальнікі заняткаў атрымалі падзякі СПБ. Гродзенскі офіс Саюза пісьменнікаў Беларусі, 19 снежня 2023 года.







Л. А. Кебіч







***Выступае Кацярына Калік***





*Ідзе практычны блок занятку*





*Упершыню ў ГГЛШ дзіцячая пісьменніца Эла Едэшка*




***Узаемная ўвага – што можа быць даражэй у творчай супольнасці!***




***Выступае Вольга Дзіканава***



***Алена Руж***



***Таццяна Лугавая і яе новы зборнік лірыкі***







*Людміла Кебіч і Дзмітрый Радзівончык*




***Выступае Соф'я Судзьіна***




***Выступае празаік Вольга Клімянкова***



*Вольга Клімянкова і Алена Шаламіцкая*






*Святлана Глембоцкая*


ПАДЗЯЧНЫ
ЛІСТ


ПАДЗЯЧНЫ
ЛІСТ


ПАДЗЯЧНЫ
ЛІСТ


ПАДЗЯЧНЫ
ЛІСТ







*Яшчэ адзін літаратурна-навучальны год стаў гісторыяй*




***Фота*** Анатоля Апанасевіча

**[www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)**
**ЛІТШКОЛА**